# Вы — наша будучыня



**Ушанаванне лаўрэатаў спецыяльных фондаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і пераможцаў міжнародных алімпіяд ды творчых конкурсаў адбылося ў Музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.**

Урачыстая цырымонія прайшла 3 лістапада. Герояў дня віталі міністр культуры Руслан Чарнецкі, міністр адукацыі Андрэй Іванец, старшыні спецфондаў Прэзідэнта па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў, па падтрымцы таленавітай моладзі.

— Вашы дасягненні — гэта і наш гонар, — звярнуўся да моладзі Руслан Іосіфавіч. — Вы наша будучыня! Дзякуй за плённую вучобу, працу і за тое, што ўслаўляеце нашу краіну.

Кіраўнік ведамства таксама падкрэсліў вялікую ролю педагогаў і ўручыў ім пасведчанні спецфонду аб прысуджэнні ўзнагароды "За ўклад у выхаванне таленавітай моладзі". Сярод ушанаваных — прафесар кафедры харэаграфіі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Святлана Гуткоўская.

— З кожным годам мы ўсё больш адчуваем падтрымку дзяржавы, і такое мерапрыемства — яркае таму пацвярджэнне, — сказала Святлана Вячаславаўна. — Калі разумееш, што тваю працу цэняць, за спінай вырастаюць крылы. Гэта натхняе і дапамагае заяўляць пра сябе на самым высокім узроўні.

Пасведчанне лаўрэата спецыяльнага фонду Прэзідэнта па падтрымцы таленавітай моладзі за выбітныя дасягненні ў галіне культуры ўручылі чатыром навучэнцам і ансамблю народнага танца "Крокі".

— Агульнавядома: талентаў шмат не можа быць. Вы — выбраныя, і менавіта ў вашых сілах развіваць нашу навуку і культуру, — адзначыла старшыня савета спецыяльнага фонду Прэзідэнта па падтрымцы таленавітай моладзі, генеральны дырэктар Вялікага тэатра Беларусі Кацярына Дулава.

Асаблівы падарунак лаўрэатам — найцікавейшую экскурсію па экспазіцыях — зрабіў музей у завяршэнне ўрачыстай сустрэчы.

